# Научная жизнь

# Навуковае жыццё

# Scientific events

## НАУЧНЫЕ МЕРОПРИЯТИЯ КАФЕДРЫ АРХЕОЛОГИИ И СПЕЦИАЛЬНЫХ ИСТОРИЧЕСКИХ ДИСЦИПЛИН ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА В 2024 г.

## НАВУКОВЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ КАФЕДРЫ АРХЕАЛОГІІ І СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў 2024 г.

## SCIENTIFIC EVENTS AT THE DEPARTMENT OF ARCHAEOLOGY AND SPECIAL HISTORICAL DISCIPLINES OF THE FACULTY OF HISTORY OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY IN 2024

У 2024 г. супрацоўнікі кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта арганізавалі дзве міжнародныя навуковыя канферэнцыі і тры часовыя выставы археалагічных знаходак. Мэтамі дадзеных мерапрыемстваў з'яўляліся ўшанаванне выбітных даследчыкаў Э. М. Загарульскага і В. Н. Рабцэвіча, садзейнічанне развіццю моладзевай навукі, а таксама азнаямленне зацікаўленых людзей з вынікамі працы археалагічнай экспедыцыі БДУ за апошнія гады.

Міжнародная навуковая канферэнцыя маладых вучоных, аспірантаў і студэнтаў «Міждысцыплінарная інтэграцыя ў археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплінах» была праведзена 4–5 красавіка 2024 г. Удзельнікі канферэнцыі прадстаўлялі розныя ўстановы Беларусі (БДУ, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Інстытут фізікі імя Б. І. Сцяпанава НАН Беларусі, Цэнтральную навуковую бібліятэку НАН Беларусі, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны) і Расіі (Інстытут археалогіі РАН, Інстытут гісторыі і археалогіі Уральскага аддзялення РАН, Бранскі дзяржаўны ўніверсітэт імя акадэміка І. Г. Пятроўскага, Наўгародскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Яраслава Мудрага, Уральскі федэральны ўніверсітэт імя першага Прэзідэнта Расіі Б. М. Ельцына, Інстытут экалогіі раслін і жывёл Уральскага аддзялення РАН, Палеанталагічны інстытут імя А. А. Барысяка РАН). З прывітальнымі словамі выступілі дэкан гістарычнага факультэта БДУ А. Г. Каханоўскі, намеснік дэкана Г. І. Маскевіч і загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін П. С. Курловіч. Загадчык навукова-даследчыцкай археалагічнай лабараторыі Вяцкага дзяржаўнага ўніверсітэта А. А. Кайсін правёў для ўдзельнікаў канферэнцыі прэзентацыю выдання «Географа-гістарычны часопіс».

Прадстаўленыя на канферэнцыі даклады былі падзелены на чатыры секцыі. Дзевяць дакладаў прысвячаліся міждысцыплінарным метадам у вывучэнні артэфактаў. Секцыйнае пасяджэнне распачаў У. С. Крумплеўскі, які прывёў асобныя прыклады біяархеалагічных даследаванняў. Аб выкарыстанні матэматычных метадаў у вывучэнні прадметаў распавялі А. Д. Гаршкоў (прымяненне параметра *tip cross-sectional perimeter* для гаспадарчай дыферэнцыяцыі элементаў кідальнага ўзбраення) і М. У. Чубароў (выкарыстанне TSCA-аналізу для вызначэн-



CC BY NC

ня спецыялізацыі касцяных наканечнікаў). Асобны блок дакладаў закранаў пытанні вывучэння хімічнага складу металічных вырабаў па даных лазернага атамна-эмісійнага спектральнага (П. А. Іванова, К. Ф. Ермаліцкая, А. Д. Сахончык, А. А. Нікітка) і рэнтгенафлюарэсцэнтнага (С. С. Юрэцкі) аналізаў. К. А. Рогач выступіла з дакладам аб крытэрыях вылучэння кастарэзных майстэрань, А. Д. Аксючыц прадставіў даклад аб даследаванні паясной гарнітуры праз прызму выяўленчых крыніц.

Падчас працы секцыі па прасторавым аналізе і геамадэляванні былі агучаны шэсць дакладаў. П. С. Курловіч на прыкладзе ўласных даследаванняў, якія праводзіліся сумесна з А. А. Сазонавым, абазначыла патэнцыял выкарыстання паветранага лазернага сканіравання ў вывучэнні археалагічных помнікаў. М. Г. Рабчэўскі азнаёміў слухачоў з першым вопытам прымянення метадаў фатаграмметрыі пры даследаванні археалагічнага помніка Хатылёва-2. Даклады Я. Д. Ягорава, які праводзіў даследаванне сумесна з А. Ю. Сакаловым, і А. А. Кайсіна былі прысвечаны выкарыстанню тэхналогій геаінфармацыйных сістэм для ўліку і вывучэння помнікаў археалогіі. Магчымасці дадзеных тэхналогій маюць вялікі патэнцыял, таму канкрэтныя аспекты тэмы дакладаў выклікалі актыўнае абмеркаванне сярод удзельнікаў канферэнцыі. Не меншую цікавасць выклікаў і даклад М. К. Глазырынай, які датычыўся звестак аб комплексным абследаванні гарадскога некропаля Новага часу. Вопыт выступлення атрымаў студэнт 1-га курса А. Мазур, які распавёў пра асаблівасці клімату ў Вялікабрытаніі часоў палеаліту.

Секцыя па гістарычна-археалагічных даследаваннях завяршыла працу першага дня канферэнцыі. Тэматыка дакладаў была markрознабаковай. Дун Ян распавёў аб уйгурскіх каменных таблічках, Чжан Сулун – аб вывучэнні Вялікага шаўковага шляху. Частка дакладаў прысвячаліся зброі ранняга жалезнага веку (У. С. Касцюк), старажытнарускім пахавальным помнікам (В. А. Дрэвіла), язычніцкім вераванням па археалагічных даных (К. С. Канавалава, Л. А. Грышан), методыцы вывучэння ваенных пахаванняў 1812 г. (І. Я. Гараўскі).

Прадстаўнічая секцыя на другі дзень канферэнцыі ахоплівала дысцыпліны біялагічнага профілю ў археалогіі. У чатырох дакладах разглядаліся пытанні палеаантрапалогіі. А. Д. Бурак акрэсліла магчымасці гістарычнай інтэрпрэтацыі палеаантрапалагічных даных на прыкладзе матэрыялаў даследавання ў Арзамасе. Даклад А. Д. Румо быў прысвечаны ўнёску А. Гудмана ў вывучэнне паталогій старажытных папуляцый. В. Я. Віннікава прадставіла вынікі працы са скелетаванымі калекцыямі з Дзяржынска (даследаванне праводзілася сумесна з А. А. Кунашам і В. І. Кошманам), М. С. Каспер распавёў аб антрапалагічнай калекцыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Тры даклады датычыліся археазаалагічнай тэматыкі. А. В. Зыль акрэсліла праблемныя пытанні ў вывучэнні калекцый з археалагічных раскопак. Накірункі вызначэння і інтэрпрэтацыі рэштак іхтыяфаўны на прыкладзе археалагічнага помніка Асавец-2 былі прадстаўлены Ю. С. Бухалкай. Матэрыял аб птушках з палеалітычнай стаянкі ў пячоры Іманай падрыхтавалі М. П. Маслінцына, Д. А. Гімранаў і М. У. Зелянкова. Секцыя завяршылася дакладам Д. С. Храброва аб дэндрахраналагічным датаванні сярэдневяковых збудаванняў Пятніцкага-2 раскопу ў Старой Русе.

Да пачатку працы канферэнцыі супрацоўнікі кафедры сумесна з прадстаўнікамі вучэбнай лабараторыі музейнай справы, а таксама з удзельнікамі студэнцкага навуковага археалагічнага гуртка падрыхтавалі выставу «Археалагічны комплекс канца I тыс. да н. э. – пачатку II тыс. н. э. Рэчкі (Вілейскі раён)». Цэнтральнае месца ў ёй занялі план археалагічных аб’ектаў, які быў выкананы пры дапамозе паветранага лазернага сканіравання, мадэль раскопу на селішчы Рэчкі-2 2020 г. і археалагічны інструментарый. З левага боку былі выкладзены знаходкі культуры штрыхаванай керамікі з гарадзішча Рэчкі-1, банцараўскай культуры і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў з гарадзішча Рэчкі-1 і селішча Рэчкі-2, а іменна вырабы з жалеза (нажы, шылы, шпоры і інш.), каляровага металу (упрыгажэнні і дэталі вопраткі), гліны (прасліцы) і шкла (пацеркі). З правага боку размяшчаліся комплексы з пахаванняў, зафіксаваных у ходзе вывучэння курганнага могільніка культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Як правіла, пахавальны інвентар прадстаўлены фрагментамі аплаўленых упрыгажэнняў і дэталей вопраткі. Частка пахаванняў была перакрыта ляпнымі пасудзінамі, перакуленымі дагары донцамі. У 2023 г. у такой пасудзіне, а іменна ў гаршку, былі знойдзены арганічныя рэшткі ў выглядзе ачышчаных і звараных зерняў проса[1]. Частка гэтай кашы таксама з’яўлялася элементам экспазіцыі. Раскопкі на археалагічных помніках каля в. Рэчкі праводзяцца археалагічнай экспедыцыяй БДУ з 2020 г. Выстава суправаджалася фотаздымкамі і выявамі лічбавых мадэлей помнікаў.

Вынікі археалагічных даследаванняў, якія праводзіліся на тэрыторыі комплексу каля в. Рэчкі, дэманстраваліся да 18 мая 2024 г. Да Міжнароднага дня музеяў на змену ёй была падрыхтавана выстава «Старажытны Мінск (да 80-годдзя вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў)». Экспанаваліся прадметы, выяўленыя ў ходзе даследаванняў на Мінскім замчышчы і гарадзішчы на р. Менцы пад кіраўніцтвам Э. М. Загарульскага – заснавальніка і першага загадчыка кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ. Да ўвагі

[1]Вызначэнне малодшага навуковага супрацоўніка Інстытута археалогіі РАН А. Ю. Сяргеева.

наведвальнікаў былі прапанаваны рэчы, якія характарызуюць матэрыяльную культуру старажытнарускага горада: керамічны посуд, шкляныя бранзалеты і пацеркі, развал візантыйскай шкляной пасудзіны, шыферныя прасліцы, элементы ўзбраення, разнастайныя вырабы з жалеза, дрэва і косткі. Выстава суправаджалася фотаздымкамі з відамі Мінскага замчышча і раскопкамі на помніку (у тым ліку з удзелам Э. М. Загарульскага), а таксама фотаздымкамі, замалёўкамі і рэканструкцыямі асобных аб'ектаў.

Міжнародная навуковая канферэнцыя «Нумізматыка на тэрыторыі Усходняй Еўропы (да 90-годдзя з дня нараджэння В. Н. Рабцэвіча)» адбылася 6 снежня 2024 г. У ёй прынялі ўдзел 26 даследчыкаў, у тым ліку 22 чалавекі выступілі з дакладамі. Імі з'яўляліся прадстаўнікі айчынных і замежных навуковых, адукацыйных і музейных устаноў, такіх як БДУ, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Музей грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Дзяржаўны гістарычны музей (Масква, Расія), Дзяржаўны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Маскоўскі Крэмль», Інстытут гісторыі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, выставачны комплекс акцыянернага таварыства «Дзяржзнак» (Санкт-Пецярбург, Расія), Геральдычны савет пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і грамадскае аб'яднанне «Нумізматычнае таварыства» (Мінск, Беларусь). Большасць даследчыкаў прысутнічалі вочна, аднак была арганізавана магчымасць удзельнічаць у канферэнцыі дыстанцыйна.

З прывітальнымі словамі выступілі дэкан гістарычнага факультэта БДУ А. Г. Каханоўскі, намеснік дэкана В. В. Рэпін і загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін П. С. Курловіч.

Падчас першай секцыі «Валянцін Навумавіч Рабцэвіч: асоба ў гісторыі» прагучалі сем дакладаў, адзін з якіх быў прадстаўлены анлайн. Былі паказаны шматлікія фотаздымкі гісторыка. Яго родныя, сябры, калегі і вучні (І. Н. Колабава, В. Н. Сядых, А. А. Яноўскі, А. І. Кушнір, М. М. Елінская, І. Ф. Масько, А. А. Вараб'ёва, Л. І. Талкачова) сказалі цёплыя словы, якія дазволілі нават тым людзям, хто не ведаў Валянціна Навумавіча асабіста, скласці ўяўленне аб ім як аб незвычайным, шчырым і яскравым чалавеку, «апантаным» даследчыку і навукоўцу, шмат зрабіўшым для фарміравання нумізматычных збораў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, стаяўшым каля вытокаў стварэння Дзяржаўнага геральдычнага рэгістра Рэспублікі Беларусь, плённа супрацоўнічаўшым з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

Працу другой секцыі «Праблемы грашовага абарачэння на тэрыторыі Усходняй Еўропы» распачаў А. В. Вайцяховіч. Яго даклад быў прысвечаны нумізматычным матэрыялам старажытнарускага часу з археалагічных раскопак, якія праводзіліся на комплексе на р. Менцы. Вялікую цікавасць прысутных выклікаў даклад па ранніх эмісіях на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага «Паражэнне Карыбута ў супрацьстаянні з Вітаўтам: нумізматычны аспект», падрыхтаваны В. В. Зайцавым і У. Г. Шапашнікам. Новы погляд на гісторыю пошуку і атрыбуцыю пояса Вітаўта выказаў І. М. Шталянкоў. На падставе пісьмовых крыніц В. С. Пазднякоў стварыў і апісаў яскравы вобраз злачынца часоў Рэчы Паспалітай. С. В. Звераў прадставіў даклад «Адмена абарачэння сеўскіх чэхаў у лістападзе 1689 г. і фіксацыя іх у казённых паступленнях у 1689–1690 гг.», блізка звязаны з адным з напрамкаў навуковых інтарэсаў В. Н. Рабцэвіча. Цікавыя і малавядомыя нават прафесійным нумізматам даныя прагучалі ў выступе «Да пытання аб абарачэнні "іншаземнай нізкапробнай манеты" ў заходніх губернях Расійскай імперыі» В. А. Шышанава. У дакладзе Р. М. Панурына была акрэслена аўтарская класіфікацыя нумізматычных матэрыялаў паўстання 1831 г. Прабліеме грашовага абарачэння складаных часоў станаўлення Мінска як сталіцы Савецкай Беларусі быў прысвечаны даклад Ю. П. Латушковай. Усяго падчас працы другой секцыі прагучалі восем дакладаў, два з якіх былі прадстаўлены анлайн.

У трэцяй секцыі «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны і фарміраванне музейных калекцый» удзельнічалі з дакладамі пяць даследчыкаў, у тым ліку адзін чалавек выступаў дыстанцыйна. С. Б. Каун у сваім дакладзе акрэсліў важную ролю манеты як гістарычнай крыніцы і шчыльных сувязей паміж нумізматыкай і крыніцазнаўствам. Выступ А. У. Цяцерніка быў прысвечаны праблеме ранняй фалерыстыкі Савецкай Беларусі. М. А. Ганчароў падрыхтаваў даклад па баністыцы «Прыднястроўскі рубель: валюта непрызнанай дзяржавы». Грунтоўны і цікавы выступ А. А. Багданава датычыўся сучаснага стану і перспектыў дзейнасці Музея гісторыі грошай акцыянернага таварыства «Дзяржзнак». В. М. Давідоўская распавяла аб гісторыі фарміравання нумізматычнай калекцыі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

Да пачатку працы канферэнцыі была прымеркавана выстава выданняў з фонду Фундаментальнай бібліятэкі БДУ і прадметаў з калекцыі вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ. Выстава дзейнічала да пачатку 2025 г. Экспанатамі з'яўляліся грошы і памятныя жэтоны нумізматычных канферэнцый, матэрыялы археалагічных раскопак пахавальных помнікаў Браслаўшчыны і курганных могільнікаў паўднёва-ўсходняй і цэнтральнай Беларусі пад кіраўніцтвам В. Н. Рабцэвіча і А. М. Плавінскага, фотаздымкі В. Н. Рабцэвіча за розныя гады, а таксама працоўныя інструменты фатографаў і археолагаў 1950–70-х гг.

Такім чынам, у 2024 г. супрацоўнікі кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін

гістарычнага факультэта БДУ правялі пяць навуковых мерапрыемстваў. Іх фармат і тэматыка адлюстроўваюць асноўныя напрамкі працы калектыву па папулярызацыі вынікаў сучасных палявых археалагічных даследаванняў, а таксама па падтрымцы памяці аб дасягненнях навукоўцаў, якія стаялі каля вытокаў кафедральнай навукі. Выстава «Старажытны Мінск (да 80-годдзя вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў)» дэманстравала вынікі даследаванняў заснавальніка і першага загадчыка кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ Э. М. Загарульскага, 95-гадовы юбілей якога адзначаўся ў снежні 2023 г. Міжнародная навуковая канферэнцыя «Нумізматыка на тэрыторыі Усходняй Еўропы (да 90-годдзя з дня нараджэння В. Н. Рабцэвіча)» і прымеркаваная да яе выстава былі прысвечаны памяці В. Н. Рабцэвіча – заснавальніка нумізматыкі ў БДУ і буйнейшага нумізмата Беларусі. З павагай да вытокаў супрацоўнікі кафедры актыўна імкнуцца да выкарыстання сучасных метадаў даследавання, надаюць значную ролю міждысцыплінарнай інтэграцыі. На гэтым фоне вялікае значэнне мела правядзенне міжнароднай навуковай канферэнцыі маладых вучоных, аспірантаў і студэнтаў «Міждысцыплінарная інтэграцыя ў археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплінах».

***П. С. Курловіч[2], Ю. П. Латушкова[3], А. Д. Сахончык[4]***

---

[2]*Полина Сергеевна Курлович* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Паліна Сяргееўна Курловіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Palina S. Kurlovich*, PhD (history), docent; head of the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *kurlovichp@bsu.by*

[3]*Юлия Павловна Латушкова* – старший преподаватель кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Юлія Паўлаўна Латушкова* – старшы выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Yulia P. Latushkova*, senior lecturer at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *latushkova@bsu.by*

[4]*Олег Дмитриевич Сахончик* – старший преподаватель кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Алег Дзмітрыевіч Сахончык* – старшы выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Oleg D. Sahonchik*, senior lecturer at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *sahonod@bsu.by*